Згода
на апрацоўку персанальных даных
(сістэма імгненных плацяжоў)

У адпаведнасці з патрабаваннямі Закона Рэспублікі Беларусь ад 07.05.2021 № 99-З «Аб абароне персанальных даных» да атрымання згоды на апрацоўку персанальных даных (далей – Згода) ААТ «ААБ Беларусбанк» прадастаўляе суб’екту персанальных даных наступную інфармацыю.

1. Аператар, які атрымлівае згоду суб’екта персанальных даных на апрацоўку персанальных даных:

ААТ «ААБ Беларусбанк», 220089, г. Мінск, пр-т Дзяржынскага, 18 (далей – Банк).

2. Мэта апрацоўкі персанальных даных: ажыццяўленне плацельшчыкам плацяжоў на карысць суб’екта персанальных даных з выкарыстаннем сістэмы імгненных плацяжоў па нумары мабільнага тэлефона (ідэнтыфікатара).

3. Пералік персанальных даных, на апрацоўку якіх даецца згода суб’екта персанальных даных:

краіна рэзідэнцтва;

прозвішча, імя, імя па бацьку (калі такое маецца); нумар
мабільнага тэлефона;

даныя дакумента, які сведчыць асобу (тып дакумента, серыя і нумар дакумента, дата яго выдачы, орган, які выдаў дакумент які сведчыць асобу, ідэнтыфікацыйны нумар (пры яго наяўнасці)); адрас месца жыхарства (месца знаходжання).

Названыя персанальныя даныя прадастаўляюцца пры дапамозе сістэмы Інтэрнэт-банкінг.

4. Тэрмін, на які даецца Згода суб’екта персанальных даных на апрацоўку персанальных даных: з дня прадастаўлення гэтай згоды і да дня заканчэння 3 (трох) гадоў з дня паступлення апошняга плацяжу (у выпадку адсутнасці плацяжоў - да дня заканчэння 3 (трох) гадоў з дня прадастаўлення гэтай Згоды), або да дня выдалення звязкі нумара бягучага (разліковага) банкаўскага рахунку і нумара мабільнага тэлефона.

5. Суб’ект персанальных даных дае згоду на перадачу персанальных даных у ААТ «Беларускі міжбанкаўскі разліковы цэнтр» для далейшай перадачы ў банкі Рэспублікі Беларусь пры правядзенні ўнутрыкраінавых імгненных плацяжоў і ў банкі Расійскай Федэрацыі пры правядзенні трансгранічных імгненных плацяжоў. Перадача персанальных даных ажыццяўляецца з выкарыстаннем сродкаў аўтаматызацыі.

У выпадку дачы суб’ектам персанальных даных згоды на апрацоўку сваіх персанальных даных, прадастаўленыя даныя будуць апрацоўвацца Банкам у мэтах і на працягу тэрміну, названых у пунктах 2 і 4 гэтай Згоды. Адмова ў 2 прадастаўленні гэтай Згоды цягне немагчымасць апрацоўкі персанальных даных у мэтах, названых у пункце 2 гэтай Згоды.

6. З прадстаўленай інфармацыяй, якая датычыцца апрацоўкі персанальных даных, азнаёмлены. Правы, механізм іх рэалізацыі, а таксама наступствы дачы гэтай Згоды або адмовы ў дачы такой Згоды растлумачаны, у тым ліку шляхам азнаямлення з Памяткай аб правах суб’екта персанальных даных і механізме іх рэалізацыі, і зразумелыя.